# Прамова І. Я. ПАЛЯКОВА

Дарагія таварышы! Сябры! Паважаныя госці!

Чвэрць стагоддзя назад свет абляцела вестка аб пераможным завяршэнні стратэгічнай беларускай аперацыі — адной з рашаючых у ходзе Вялікай Айчыннай вайны. З ліпеня 1944 года нашы доблесныя воіны пры актыўнай дапамозе партызан вызвалілі сталіцу рэспублікі горад Мінск.

Чырвоны сцяг вялікага Леніна высока ўзвіўся над шматпакутнай, змучанай зямлёй. Пад гэтым усёперамагаючым сцягам савецкія людзі ішлі ў бой і грамілі ворага, ён натхняў іх на працоўныя подзвігі, памнажаў сілы для аднаўлення і развіцця разбуранай ворагам народнай гаспадаркі. Пад гэтым сцягам мы і цяпер ажыццяўляем прадвызначэнні Камуністычнай партыі, узводзім светлы будынак камунізма. Сцяг Леніна азарае нам шлях, натхняе на новыя подзвігі і здзяйсненні.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы